# ТЫДЗЕНЬ ПАЗНАННЯ І ТВОРЧАСЦІ

На філалагічным факультэце нашага ўніверсітэта ўжо ў пяты раз праходзіў Тыдзень пазнання ў творчасці. Адкрыў яго конкурс праектаў «Шляхамі беларускага пісьменства», у якім прынялі ўдзел студэнты першага і трэцяга курсаў. Спачатку на суд журы, у склад якога ўваходзілі загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Генадзь Антонавіч Арцямёнак, дацэнт кафедры літаратуры Віталь Феліксавіч Падстаўленка і студэнтка пятага курса Галіна Кушнярэвіч, свае праекты прадставілі першакурснікі. Так, 11-я група падрыхтавала праект «Кніга – наш дзіўны скарб», 13-я група – «Званы Хатыні», 16-я група – «Шлях на трыбуну Шведскай акадэміі», 101-я група – «Мастацкія асаблівасці і каштоўнасці творчасці Алеся Разанава», 102-я група – «Экалогія душы», 104-я група – «Народны дыпламат».

Затым свае творчыя работы прэзентавалі хлопцы і дзяўчаты трэцяга курса: «Беларуская літаратура праз прызму культуры і мастацтва» (31-я група), «Шляхамі беларускага пісьменства ў ВДУ імя П.М. Машэрава» (33-я група), «Жыццё і творчасць Васіля Быкава» (301-я група), «Жыццё і творчасць Пімена Панчанкі» (302-я група), «Уласнае, блізкае і знаёмае» (303-я група), «Жыццё і творчасць Аркадзя Куляшова» (304-я група).

У апошні дзень Тыдня пазнання і творчасці былі падведзены вынікі конкурсу. Трэцяе месца занялі студэнты 302-й групы, другое – падзялілі хлопцы і дзяўчаты 303-й і 16-й груп, а пераможцамі сталі філолагі 13-й групы.

Акрамя таго, у межах Тыдня праводзіўся завочны конкурс эсэ «Навука ў жыцці, жыццё ў навуцы», у якім прынялі ўдзел студэнты філалагічнага факультэта і навучэнцы школ і гімназій горада. Лепшымі работамі былі прызнаны эсэ Паліны Слесаравай (гімназія № 3), Дар'і Калакольцавай (СШ № 4), Алесі Мядзель (1 курс ФлФ).

**Яўгенія ПУДАВА,**
**студэнтка 1 курса**
**ФлФ.**